СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на родннай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ВЕРАСНЯ 2017 г. АЎТОРАК №170 (28534)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Аўтамабільная «ЭРА»



Прывітанне з Калінінграда



Што такое панкратыён?

СТАР. 15

ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КРУТОЙ, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«На наступны год сфарміраваны практычна бездэфіцытны плацежны баланс. Мы плануем захаваць золатавалютныя рэзервы на ўзроўні, не меншым як $6 млрд. Абслугоўваць будучыя знешнія плацяжы ў аб'ёме, большым як $3 млрд, збіраемся за кошт работы эканомікі. У наступным годзе Беларусь не плануе прыцягваць новыя знешнія пазыкі. Што датычыцца курса беларускага рубля на пачатак і канец 2018 года, то аслабленне мы бачым у дыяпазоне ўсяго толькі 5—6 працэнтаў. Курс непасрэдна звязаны з тэмпам інфляцыі, які вызначаны на ўзроўні да 7 працэнтаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9251 | ▼ |
| Еўра | 2,2903 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0333 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0742 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Свята

# На скрыжаванні духоўнасці і культуры

Полацк — не толькі калыска дзяржаўнасці, але і сімвал нацыянальнага аднаўлення



**Сёлета Дзень беларускага пісьменства быў прымеркаваны адразу да двух знакавых юбілеяў — 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і 1155-годдзя найстаражытнейшага беларускага горада — Полацка. Невыпадкова менавіта Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці, радзіма нашага першадрукара, быў абраны сталіцай знакавага свята.**





Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Можна сказаць, што пэўная дзея зжывае сябе, калі з году ў год паўтараецца адно і тое ж і не дадаецца нічога новага. У гэтым сэнсе Дзень беларускага пісьменства ў Полацку апраўдаў давер і парадаваў, прадставіўшы ўласныя цікавінкі. Тут можна было ўбачыць тое, чаго не адбывалася ў іншых гарадах — сталіцах Дзён пісьменства. Найперш ладзілася шмат тэатралізаваных пастановак — прычым не спектакляў у іх класічным разуменні і зусім не на тэатральных падмостках. Драматычны захоп Полацка варагамі, перамога над ворагам, гульбішчы мясцовых хлопцаў і дзяўчат, але быццам з далёкага Сярэднявечча, можна было ўбачыць і каля галоўнай канцэртнай пляцоўкі, і на схілах прыгажуні-Дзвіны каля Сафійскага сабора. Адметна і тое, што бадай ці не ўсе артысты, гандляры і нават кухары былі прыбраныя ў вышываныя строі. Вышыванкамі былі запоўненыя і шматлікія гандлёвыя шапікі. І чаму мы яшчэ не бачым вышываных кашуль, надзетых на кожным другім мінаку, дык, пэўна таму, што каштуюць яны ўсё-ткі не так танна... Пэўна, наступным крокам будзе ўвядзенне ў масавы ўжытак шляхецкіх строяў.

## Прасякнуты гістарычнасцю, драматычнасцю і знакавасцю

Адным з сімвалаў свята стаў новы помнік, усталяваны ў адным з самых маляўнічых месцаў горада — на стромкім беразе Дзвіны, побач з Сафійскім саборам, — памятны знак «Полацк — сталіца беларускай дзяржаўнасці». Зроблены ён у выглядзе шматлікіх шчытоў, складзеных разам. На іх — выявы важных гістарычных асоб Полаччыны (якія шмат значаць і для ўсёй Беларусі). Крайнія шчыты быццам накладваюцца адзін на адзін і іх выяў не бачна. Гэта азначае, што не ўсіх важных асоб, натуральна, удалося змясціць на помніку. Акрамя таго, імёны некаторых знакавых для гісторыі людзей не трапілі ў летапісы...

На адкрыцці памятнага знака **намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО** адзначыў:

— Прыемна на гэтым старажытным месцы адчуваць подых гісторыі і прымаць непасрэдны ўдзел у напісанні новай старонкі ў жыцці нашай дзяржавы. Сімвалічна, што памятны знак усталяваны менавіта тут, на гары, недалёка ад таго месца, дзе ў XI стагоддзі быў збудаваны храм Святой Сафіі. Пра старажытны горад расказваюць легенды, сведчаць летапісы. Ён шмат стагоддзяў сустракаў гасцей званамі Сафіі і свята захоўваў як царкву, так і крыж Ефрасінні Полацкай. Адкрыццё памятнага знака сведчыць пра тое, што Полацк сапраўды стаў скрыжаваннем духоўнасці і культуры, нашага дзяржаўнага аднаўлення.

СТАР. 13

■ Кватэрнае пытанне

# НОВАБУДОЎЛЯ: У РАСТЭРМІНОЎКУ АБО Ў КРЭДЫТ?

Цяпер пры куплі новага жылля неабходна мець на руках толькі 4,5 тысячы долараў

**Сёння цікавасць да новабудоўляў знаходзіцца ў спажыўцоў на стабільна высокім узроўні і нават расце, ігнаруючы ўсе правілы сезоннасці. Згодна з апытаннем патэнцыйных пакупнікоў кватэр, больш за 80% з іх разглядае для набыцця менавіта новабудоўлю.**

А ў сітуацыі, калі большасць новага жылля прапануецца ў растэрміноўку, кошт крэдытаў на куплю нерухомасці памяншаецца, а абменныя курсы валют цешаць сваёй стабільнасцю, лагічна выказаць здагадку, што запыты пакупнікоў павялічацца. Мы вырашылі разабрацца, як падобная сітуацыя паўплывала на цэны новабудоўляў і ці сапраўды змяніліся аб'екты зацікаўленасці пакупнікоў.

## ВЫБІРАЮЦЬ «ЭКАНОМ» І «СТАНДАРТ»

Дык вось. Істотнага змянення цэн з пачатку года не адзначаецца — змены назіраюцца толькі з-за руху дамоў па стадыях будаўнічай гатоўнасці. Аднак, нягледзячы на адсутнасць эканамічных узрушэнняў і зніжэння ставак па крэдытах, на думку кіраўніка аддзела агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Наталлі Радзені, пакупніцкая здольнасць насельніцтва і цяпер застаецца невысокай.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!